УДК 808.26-3

# Да ўдакладнення паняцця «ідыялект»

Пятрова Н.Я.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Сучасны стан філалагічнай навукі прымушае перагледзець дэфініцыю «мова мастацкай літаратуры». Мастацкае маўленне – гэта ў першую чаргу дзейнасць мастакоў слова, кожны з якіх па-свойму адлюстроўвае складаную і шматаспектную сітэму агульналітаратурнай мовы, што звязана са светапоглядам, схільнасцямі пісьменніка і г.д. Таму, прымаючы за аснову наяўнасць моўнай спецыфікі ў межах творчасці кожнага аўтара, лічым правамерным замест паняцця «мова мастацкай літаратуры» выкарыстоўваць тэрмін «мастацкі ідыялект», які ў першую чаргу мае на ўвазе індывідуальнае маўленне.

Індывідуальнае маўленне – гэта не толькі індывідуальная словатворчасць, якая ствараецца майстрамі слова ў мастацкіх творах, бо «слоўнік – гэта яшчэ не сама мова, а толькі яе падсістэма». У аснове індывідуальнага маўлення ў першую чаргу знаходзяцца агульналітаратурныя нормы, якія носьбіт ідыялекту выкарыстоўвае з улікам моўнай спецыфікі і творчых адносін. Пад моўнай спецыфікай трэба разумець «не супрацьпастаўленне "моўнага" – такому "маўленчаму", якое не дацягвае да статуса "мовы" і застаецца з пункту гледжання літаратурнай мовы "аказіянальным", "суб'ектыўным", а злучэнне таго і другога». Рэалізуючы свае творчыя патэнцыі, пісьменнік пераўтварае стандартную сістэму мовы ў спецыфічную сістэму сваёй рэпрэзентацыі, якая і вызначае ідыялект.

Згодна з традыцыйным поглядам на паняцце «ідыялект», яно вызначаецца як сума (сукупнасць) асаблівасцей маўлення носьбітаў мовы. У большасці лінгвістычных прац тэрмін «ідыялект» выкарыстоўваецца як сінанімічны тэрміну «ідыястыль». Разам з тым, работы асобных мовазнаўцаў скіроўваюць на тое, што такія паняцці, як «ідыялект», «ідыястыль», тоеснымі лічыць нельга. Больш дакладныя азначэнні гэтых дэфініцый акрэсліла А.В. Бялова, паводле працы якой «ідыялект – гэта сукупнасць моўных сродкаў, што фарміруюць ідыястыль», а «ідыястыль – гэта глыбінная моўная структура, што ствараецца паводле падпарадкавання сістэмы ідыялекту свабодзе пісьменніка, яго рэфлексіі». У нашай рабоце тэрміналагічная намінацыя «ідыялект» кваліфікуецца ў якасці сукупнасці кампанентаў аўтарскай моўнай сістэмы, якая вызначае індывідуальныя мадэлі і спецыфіку выкарыстання агульналітаратурных сродкаў, выяўляе іх ролю ў аўтарскай рэпрэзентацыі, а таксама адлюстроўвае дынаміку іх асваення.